# ЧАС ПАТРАБУЕ АД УРАДА МАКСІМАЛЬНЫХ НАМАГАННЯЎ І НЕСТАНДАРТНЫХ РАШЭННЯЎ

Аб стылі і метадах работы ўрада краіны ішла размова на пасяджэнні ў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 7 кастрычніка. У ім прынялі ўдзел прэм'ер-міністр Сяргей Лінг, віцэ-прэм'еры, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Міхаіл Мясніковіч, старшыня Камітэта Дзяржаўнага кантролю Андрэй Кабякоў, Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Віктар Шэйман, Старшыня праўлення Нацбанка Пётр Пракаповіч, кіраўнікі міністэрстваў, абласцей, іншыя службовыя асобы.



Менавіта гэты ўрад пад кіраўніцтвам прэзідэнта распрацоўваў як знешнюю, так і ўнутраную палітыку краіны, адзначыў прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў сваім ўступным слове. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў свой час кіраўніцтва Беларусі стаяла перад выбарам: якім шляхам ісці. Быў шлях так званай шокавай тэрапіі, па якім многія адыходзілі ад планавай эканомікі. Быў і іншы шлях — рынычная свабода па прынцыпу заходніх дзяржаў. Аднак рэспубліка пайшла сваёй дарогай. Гэта дарога да рыначных адносінаў вядзе праз даволі працяглы пераходны перыяд, пры якім захоўваецца дзяржаўнае рэгуляванне працэсаў, што адбываюцца ў эканоміцы. Як знешняя, так і ўнутраная палітыка дзяржавы ажыццяўляецца сіламі ўрада. Ён абавязаны рэалізоўваць праграмы, якія выпрацоўваў.

Разумеючы сваю адказнасць за гэта, прэзідэнт і прад'яўляе сур'ёзнае патрабаванне Савету Міністраў, тым, хто ўзначальвае міністэрствы, іншыя кіраўніцкія структуры. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што нарада не носіць ніякай надзвычайшчыны. Яна мае планавы характар, паколькі намечана была яшчэ ў красавіку.

Галоўная тэма парадку дня разглядалася праз прызму сацыяльна-эканамічнага становішча ў краіне. Размова на пасяджэнні адбылася вельмі дзелавая і прынцыповая. «Нельга сказаць, што ўрад не прымае ніякіх мер па кіраўніцтву сацыяльна-эканамічным комплексам, стабілізацыі сітуацыі, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Аднак сур'ёзныя адмоўныя тэндэнцыі, якія намеціліся ў эканоміцы ў пачатку года, працягваюць развівацца, і гэта не дае магчымасці рабіць аптымістычныя вывады і заспакойваць сябе». Матэрыялы, прадстаўленыя рознымі органамі кіравання, аналіз эканамічных паказчыкаў, асабістае азнаямленне кіраўніка дзяржавы з рэальным становішчам спраў, ходам падрыхтоўкі да зімы, работай гандлю, далі магчымасць зрабіць вывад аб істотных недахопах у дзейнасці Савета Міністраў.

Прэзідэнт нагадаў, што галоўная мэта сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ў 1999 годзе была вызначана як дасягненне фінансавага аздараўлення эканомікі. Нягледзячы на тое, што шэраг галін народнай гаспадаркі, значная колькасць прадпрыемстваў і нават цэлыя рэгіёны з гонарам выходзяць на зацверджаныя паказчыкі, у цэлым па краіне фінансавая стабілізацыя пагоршылася. Асаблівую заклапочанасць і нездавальненне насельніцтва выклікаюць высокія тэмпы інфляцыі, якія больш чым у два разы перавышаюць прагнозны ўзровень, пагаршэнне фінансавага стану суб'ектаў гаспадарання. Размова ідзе аб іх плацежаздольнасці, забяспечанасці ўласнымі абаротнымі сродкамі, тэндэнцыі спаду інвестыцый у рэальны сектар эканомікі. Працягвае расці запазычанасць па плацяжах у бюджэт, актуальнай застаецца праблема збіральнасці падаткаў, не забяспечана выкананне і асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі. Усё гэта, лічыць кіраўнік дзяржавы, у многім абумоўлена сур'ёзнымі недахопамі ў стылі і метадах работы Савета Міністраў.

Да ліку недахопаў у рабоце ўрада Аляксандр Лукашэнка аднёс павярхоўныя, не разлічаныя на перспектыву адносіны да цэнавай, жыллёвай, транспартнай, экспартнай палітыкі. Ён выказаў папрок у адрас віцэ-прэм'ера Генадзя Навіцкага, які недастаткова аналізуе сітуацыю ў будаўніцтве жылля. Па сутнасці не выканана прамое ўказанне прэзідэнта будаваць хутка, якасна і танна. Расце колькасць дамоў, якія знаходзяцца ў незавершаным будаўніцтве, цэнавая бязмежжа выклікае справядлівае абурэнне людзей. Што датычыць цэн на экспартуемую прадукцыю, то тут, на думку кіраўніка дзяржавы, ёсць хібы ў рабоце міністраў эканомікі і фінансаў Уладзіміра Шымава і Мікалая Корбута.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы